# закрыты клуб

**У Беларусі ўжо сфарміраваны тэрытарыяльныя камісіі па правядзенні рэферэндуму. Шырока распаўсюджана меркаванне, што гэтыя камісіі – нешта накштальт закрытага клуба, у які маюць допуск адны і тыя ж людзі. Народная Воля вырашыла гэта праверыць эксперыментальным шляхам.**

Для прыкладу мы ўважліва прааналізавалі склад Барысаўскай раённай камісіі па правядзенні рэферэндуму.

Камісія сфарміравана ў складзе 13 чалавек, узначальвае яе Лілія Чэча.

Спадарыня Чэча – дырэктар Барысаўскага дзяржаўнага каледжа. У склад камісіі вылучана раённай арганізацыяй «Белая Русь». На вяршыні Барысаўскай раённай выбарчай піраміды яна з 2019 года, калі адбываліся выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Уваходзіла ў склад камісіі і падчас прэзідэнцкіх выбараў. Такім чынам, рэферэндум – гэта для яе трэцяя палітычная кампанія ў выбаркаме.

Намеснік старшыні – Аляксандр Мардасаў. Вылучаны групай грамадзян. Але ў звычайным жыцці спадар Мардасаў таксама падначалены спадарыні Чэчы, бо ў тым жа каледжы з’яўляецца загадчыкам аднаго з аддзяленняў. Для яго гэта таксама будзе трэцяя палітычная кампанія ў складзе раённай камісіі.

Сакратар камісіі – Ала Пяцько. Фармальна яна вылучана ў склад тэрытарыяльнай камісіі па рэферэндуме групай грамадзян. Але спадарыня Пяцько з’яўляецца спецыялістам па арганізацыйна-кадравай рабоце грамадскага аб’яднання «Белая Русь». Такім чынам, у складзе камісіі мы маем ужо як мінімум двух прадстаўнікоў аднаго і таго ж праўладнага грамадскага аб’яднання. І трэцяга чалавека, для якога гэта будзе трэці «прызыў» у раённую выбарчую камісію. Але гэта далёка да сапраўднага барысаўскага рэкардсмена.

Інеса Арыніч у склад камісіі сёлета трапіла ад прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. І адбылося гэта ажно ў дзясяты (!) раз. Спадарыня Арыніч яшчэ ў 2008 годзе як спецыяліст упраўлення адукацыі райвыканкама ўвайшла ў склад акруговай камісіі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і з таго часу мала якую палітычную кампанію прапусціла.

Паўтарыць гэты рэкорд мае шанцы Павел Цырлін, які ўвайшоў у склад раённай камісіі ў восьмы раз.

З некаторым адрывам ад «лідараў» ідзе цэлая «група грамадзян».



**«Не пора ли к народу обратиться, объясниться? Нет, отвечает Песков, не пора, все идет по плану»** Про атаку беспилотников по Москве и Подмосковью.




**«Мы же понимаем, что «ошибки» — это не про белорусскую власть»** Она-то в своих глазах ошибок не совершает. Или о скандале с ЦЭ.



**Глас народа: «Приезжайте, украинцы, мы вас ждем, любим»** Россияне — о боях за Бахмут и не только.

Іна Балашова ўзначальвае Сацыяльна-педагагічны цэнтр Барысаўскага раёна. Рэферэндум будзе для яе пятай палітычнай кампаніяй у складзе раённай камісіі. Вылучыў спадарыню Балашову ў камісію Саюз жанчын.

Пятая кампанія і ў Наталлі Злобіч. Што не дзіўна: раней спадарыня Злобіч з'яўлялася галоўным ідэолагам «Барысаўдрэва».

У пяты раз будзе засядаць у раённай камісіі і Юлія Саматыга, дырэктар Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна.

Астатнім да «рэкардсменаў» яшчэ працаваць і працаваць.

У чацвёрты раз у склад раённай камісіі ўвайшла Таццяна Мышлёнак, якая ўзначальвае юрыдычны аддзел райвыканкама. У склад камісіі яе вылучала «група грамадзян».

Трэцяя кампанія будзе ў Наталлі Дзмітрыевай, якую ў склад камісіі вылучыў працоўны калектыў школы №8, у якой яна з'яўляецца дырэктарам.

Упершыню на раённы ўзровень кіравання народным галасаваннем выйшлі: Антаніна Котава, якая ўзначальвае мясцовы прафсаюз работнікаў АПК, і першы сакратар раённага БРСМ Уладзіслава Крагілева.

Ёсць у тэрытарыяльнай камісіі па правядзенні рэферэндуму і трэці навічок. Гэта Марына Несцярэнка. Хоць і фармальна спадарыня Несцярэнка вылучана грамадзянамі, але дзіўным чынам яна мае дачыненне і да старшыні камісіі, і да яе намесніка, бо таксама працуе ў Барысаўскім дзяржаўным каледжы і займае пасаду намесніка дырэктара.

**Гэта законна?**

Вытрымка з арт.34 Выбарчага кодэкса:

«Органы, якія ўтвараюць камісію, як правіла, не менш за адну трэць яе складу фарміруюць з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Гэта палажэнне не прымяняецца пры фарміраванні ўчастковых камісій, якія ўтвараюцца ў бальніцах і іншых установах аховы здароўя, што аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама за межамі Рэспублікі Беларусь.

У склад камісіі не могуць уваходзіць суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

Дзяржаўныя служачыя не могуць складаць больш за адну трэць складу камісіі. Гэта палажэнне не прымяняецца пры ўтварэнні ўчастковых камісій за межамі Рэспублікі Беларусь».

Выбарчы кодэкс нібыта прадугледжвае, што ў склад камісіі павінны ўваходзіць людзі розных палітычных поглядаў, прадстаўнікі розных арганізацый і устаноў, а не толькі тыя, хто займае дзяржаўныя пасады.

Што мы маем у Брысаўскім раёне? Тры чалавекі з трынаццаці працуюць у адной установе. Сем з трынаццаці маюць дачыненне да ўпраўлення адукацыі райвыканкама. Дзевяць з трынаццаці маюць дачыненне да райвыканкама. З вялікай верагоднасцю можна выказаць здагадку, што




**«Не просто акт унижения – это трофей»** Что творят российские непо-детки – дети-чиновники, чьи родители – тоже чиновники, которые высоко во власти.



**Пастухов: «Жизнь четырех поколений, выброшенная на ветер»** О чем должна болеть голова россиян. А Путин – сгинет в небытие.

ЕЩЕ КАРТИНА ДНЯ

ПОПУЛЯРНЫЕ МНЕНИЯ



**Юрый Дракахруст**

*Варта яшчэ дадаць адзін момант. Гэть рабіць, здарыўся пасля саміту ў кітайс Цэнтральнай Азіі. І дзе той жа Такаеў а Маскве.*

ЕЩЕ МНЕНИЯ

LIFE

калі не ўсе, то амаль усе члены камісіі ўваходзяць у праўладную грамадскую арганізацыю «Белая Русь».

У складзе камісіі толькі тры новыя асобы: адну з іх кіраўніцтва камісіі ведае асабіста па сумеснай працы, дзвюх астатніх добра ведаюць у райвыканкаме, бо яны прадстаўляюць афіцыйны прафсаюз і праўладную маладзёжную арганізацыю.

Дык пра якую дэмакратыю мы гаворым?

Сітуацыя ў Барысаве цалкам пацвярджае распаўсюджаны тэзіс пра «закрыты клуб». І пра тое, што выбары і рэферэндумы ў Беларусі робяцца рукамі пераважна жанчын. І пра тое, што галоўная роля ў гэтым адведзена настаўнікам. Прычым гэты «клуб» робіцца ўсё больш закрытым, бо нават вылучэнцам праўладных партый месца ў ім не знайшлося. Па крайняй меры калі мы гаворым пра Барысаў.

З афіцыйных трыбун штодня нам кажуць, што рэферэндум па Канстытуцыі – гэта крок да палітычнай рэформы, да пашырэння народаўладдзя, да новага этапу дэмакратызацыі жыцця грамадства. Але тое, як арганізаваны гэты рэферэндум, прымушае думаць не пра крок наперад, а пра крок назад.

Оцените статью 1 2 3 4 5 Средний балл 2.6 (17)

## ЧИТАЙТЕ ЕЩЕ



Лукашенко назначил нового главу Госпогранкомитета – тот родом из России




Тертель, Глеб, Гигин, Марзалюк... Кто попал в санкционный список...



Фридман: «Токаев поддел Лукашенко, чтобы показать самостоятельную позици...



Шрайбман: «Калі ядзерная зброя ў сталым рэжыме будзе размяшчацца ў...




Пастухов: «Скорейшее вступление Украины в НАТО отвечает национальным...



Навумчык: «Сытуацыя з размяшчэньнем ядзернай зброі ў Беларусі значна...

## ИЗБРАННОЕ



Звезда «Сверхъестественного» в Киеве. И Шевченко тоже



В Харькове станцевали выпускной вальс на фоне разбомбленной школы



Лёва Би-2: долгий путь к иноагентству и пониманию катастрофы



Фотожабы: «Планы на июнь»

ЕЩЕ



**Мирзализаде: «Мне писали люди: «Не сидел — не белорус». И мне было...**



**«Сказал, что его зовут Николай, и «с меня этого достаточно»**



**Морозов: «Лукашенко окончательно, как степлером, пришивает себ...**



**«Какой сегодня праздник? Праздник какой сегодня? А твой дед воевал? Отвечай!»**



**«Лічбы зняволеных не ўкладваюцца ў галовах людзей»**



**Россия уплатила чудовищную цену за Бахмут. И что она получила?**



Независимые новости и комментарии о событиях в Беларуси. При использовании материалов "Салідарнасці" гиперссылка на сайт обязательна.

© "Салідарнасць", 2005-2023

gazetaby@gmail.com, reklama.gazetaby@gmail.com

Подпишитесь на вечернюю рассылку "Салідарнасці". Этот надежный канал, который позволяет читать наши новости и статьи даже в условиях блокировки сайта.

Email*

Ваша электронная почта

Подписаться

Предоставлено SendPulse